УДК 343.985

*А.Я. Гучок*

## УСТАНАЎЛЕННЕ ФАКТАЎ НЕСАМАСТОЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДЫСЕРТАЦЫЙ АСОБНЫМІ СРОДКАМІ АПЕРАТЫЎНА-ВЫШУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Пастаноўка праблемы.** У 2018 г. у выніку правядзення аналізу беларускага сегмента сеткі Інтэрнэт Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь было выяўлена 46 інтэрнэт-сайтаў, на якіх рэкламавалася дзейнасць па напісанню на заказ на платнай аснове магістарскіх, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый практычна па ўсіх галінах навукі і па ўсіх навуковых спецыяльнасцях. Разам з названымі кваліфікацыйнымі навуковымі працамі актыўна прапануецца падрыхтоўка школьных сачыненняў, кантрольных работ, лабараторных работ для каледжаў, справаздач па практыцы, курсавых і дыпломных прац для ўстаноў вышэйшай адукацыі, справаздач аб навукова-даследчых работах любога ўзроўню і інш.

ВАК з мэтай спынення незаконнай рэкламнай дзейнасці накіравала ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь, а таксама ў Брэсцкі, Гомельскі, Мінскі абласныя і Мінскі і Магілёўскі гарадскія выканаўчыя камітэты адпаведныя матэрыялы для ліквідацыі парушэнняў заканадаўства аб рэкламе.

Разам з тым рост колькасці суб’ектаў, якія прапануюць адзначаныя вышэй паслугі, іх распаўсюджанасць па ўсіх рэгіёнах краіны, дзе функцыянуюць установы вышэйшай адукацыі і каледжы, а таксама пастаянная наяўнасць вакансій на прадпрыемствах такога роду дзейнасці дазваляе выказаць здагадку аб высокай верагоднасці з’яўлення ў бліжэйшай перспектыве прэцэдэнтаў прадстаўлення да абароны несамастойна падрыхтаваных дысертацый.

**Шляхі вырашэння праблемы.** На нашу думку, паслугі па напісанню на заказ навуковых прац рознага ўзроўню, роўна як і прадстаўленне да абароны несамастойна падрыхтаваных дысертацый, уяўляюць сабой адзін з відаў супрацьпраўнай дзейнасці. У выпадку ўстанаўлення факта абароны несамастойна падрыхтаванай дысертацыі з яе наступным праходжаннем усіх устаноўленых законам працэдур і зацвярджэннем Прэзідыумам ВАК рашэння савета па абароне дысертацый альбо прысуджэннем вучонай ступені доктара навук па такой працы вынік будзеануляваны шляхам пазбаўлення атрыманай вучонай ступені.



Адзначым, што несамастойна падрыхтаваная дысертацыя ўяўляе сабой кваліфікацыйную навуковую працу і па выніках яе атэстацыі асобе, якая не з’яўляецца аўтарам даследавання, прысуджаецца вучоная ступень. Разам з тым у нядобрасумленнага вучонага з’яўляецца адпаведная магчымасць атрымліваць пэўныя грашовыя выплаты (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 верасня 2007 г. № 450 «Аб устанаўленні даплат за вучоныя ступені і званні»). Зыходзячы з гэтага, лічым мэтазгодным падкрэсліць, што кожны такі факт павінен атрымліваць прававую ацэнку праваахоўных органаў з прыняццем рашэння, прадугледжанага арт. 174 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым у аспекце рашэння задач аператыўна-вышуковай дзейнасці (папярэджанне, выяўленне, спыненне злачынстваў, а таксама выяўленне грамадзян, якія іх падрыхтоўваюць або ўчыняюць) неабходныя звесткі для прыняцця рашэння могуць быць атрыманы ў тым ліку і з дапамогай:

ініцыявання праваахоўнымі органамі актыўнасці арганізацый (юрыдычных асоб, якія могуць мець адносіны да падрыхтоўкі дысертацый на заказ), у частцы рэалізацыі імі права, прадугледжанага арт. 11 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці», а менавіта прадастаўляць органам, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, звесткі, неабходныя для выканання іх задач;

праверачнай закупкі, прычым як набыцця без мэты спажывання або збыту ў грамадзяніна, арганізацыі прадметаў і звестак, так і ажыццяўлення заказу на выкананне работ (аказанне паслуг). Пры гэтым заканадавец устанавіў, што ажыццяўленне заказу на выкананне работ (аказанне паслуг) у выпадку, калі дзеянні заказчыка па падрыхтоўцы і ажыццяўленню такога заказу забаронены крымінальным законам пад пагрозай пакарання, павінна праводзіцца ў рамках аператыўнага эксперыменту. Гэта можа тычыцца падрыхтоўкі дысертацый, якія змяшчаюць дзяржаўныя сакрэты, і махлярства з боку выканаўцаў.

Выкарыстанне пазначаных і іншых сродкаў аператыўна-вышуковай дзейнасці разам з аналітычнай працай і правядзеннем комплексных судовых аўтара- і літаратуразнаўчых экспертыз адкрывае перспектывы больш актыўнага і сістэмнага супрацьдзеяння фактам несамастойнай падрыхтоўкі кваліфікацыйных навуковых прац з прыцягненнем да адказнасці (у тым ліку крымінальнай) як заказчыкаў, так і выканаўцаў ілжывых дысертацый з усімі саўдзельнікамі.